

Якой будзе «разынка» Магілёва?



Аналізуючы «Лістапад»



Што прапануе сучасная пошта?

МС СТАР. 5 СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЛІСТАПАДА 2016 г. СЕРАДА № 226 (28336)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# НА АГУЛЬНАЙ МОВЕ

## Рабочы візіт Прэзідэнта Беларусі ў Маскву засведчыў духоўнае адзінства нашых народаў



Фота БЕЛТА.

**Аб сваім візіце ў Маскву і маючай адбыцца сустрэчы з Уладзімірам Пуціным Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка паведаміў яшчэ на мінулым тыдні падчас прэс-канферэнцыі для расійскіх рэгіянальных СМІ, адзначыўшы, што яму з расійскім калегам «трэба абмеркаваць некаторыя прынцыповыя пытанні».**

Але была яшчэ адна прыемная нагода падчас рабочага візіту Прэзідэнта Беларусі ў расійскую сталіцу. У храме Хрыста Збавіцеля Аляксандр Лукашэнка разам з Уладзімірам Пуціным удзельнічаў ва ўрачыстай цырымоніі віншавання Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла, які напярэдадні адзначыў 70-годдзе.

Віншуючы Патрыярха не толькі ад сябе, але і ад беларускага народа, у якасці падарунка Аляксандр Лукашэнка паднёс юбіляру Слуцкі пояс і карціну, на якой намаляваны Свята-Нікольскі гарнізонны сабор у Брэсце.

Выступаючы на ўрачыстай цырымоніі віншавання Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла, Прэзідэнт адзначыў уклад прадстаяцеля ва ўмацаванне духоўнага адзінства Беларусі і Расіі, заснаванага на такіх хрысціянскіх каштоўнасцях, як міралюбнасць, узаемадапамога, гуманізм і справядлівасць.

«Сёння ваша служэнне на пасадзе прадстаяцеля Рускай праваслаўнай царквы накіравана на захаванне маральных пачаткаў жыцця грамадства, духоўных і культурных традыцый нашага праваслаўя, выхаванне падрастаючага пакалення, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Патрыяршаства — гэта найцяжэйшая штодзённая праца і каласальны цяжар адказнасці. Вера, мудрасць, стойкасць і сіла духу дапамагаюць вам у выкананні высакароднай місіі».

«Дзякуючы вашай актыўнай жыццёвай пазіцыі Царква іграе важную ролю ў падтрыманні згоды ў грамадстве, дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі, захаванні міру і стабільнасці на планеце», — сказаў беларускі лідар.

Пасля ўрачыстай цырымоніі кіраўнікі дзяржаў накіраваліся ў Крэмль для правядзення двухбаковай сустрэчы.

Беларусь і Расія не ізаляваны ад сусветных крызісаў і вымушаныя сумесна аператыўна рэагаваць на іх, заявіў Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы. Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што цяпер даволі бурныя часы, калі то з аднаго, то з другога боку накатваюць рознага роду крызісы. «Мы не ізаляваны ад гэтага. Ёсць аператыўныя пытанні, якія мы павінны хутка вырашаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён выказаў упэўненасць, што разам з Уладзімірам Пуціным, як гэта бывала і раней, яны прымуць верныя рашэнні.

Прэзідэнт Беларусі падзякаваў Уладзіміру Пуціну за ідэю разам павіншаваць Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла з юбілеем. «Гэта добры штрых да адносін двух прэзідэнтаў, двух блізкіх, родных народаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін заявіў, што Беларусь застаецца найважнейшым гандлёва-эканамічным партнёрам Расіі. Ён канстатаваў, што ў мінулым годзе адбылося зніжэнне беларуска-расійскага тавараабароту. «Але гэта ўсё часова», — перакананы Прэзідэнт Расіі. Пераадольваць цяжкасці, на яго думку, дапамагаюць створаныя паміж Беларуссю і Расіяй механізмы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Прэзідэнт Расіі адзначыў, што паміж дзвюма краінамі назіраецца рост узаемных інвестыцый, пашыраюцца кааперацыйныя сувязі. На яго думку, усё гэта перадумовы для таго, каб рухацца далей.

**Паводле БЕЛТА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ХУТКА БУДЗЕ ЁЛКА!

**У Мінску пачалася ўстаноўка навагодніх ёлак. Спецыялісты «Мінскрэкламы» паспелі ўжо зманціраваць зялёных прыгажунь каля комплекса «Чыжоўка-арэна», Лядовага палаца на вуліцы Прытыцкага, у парку імя Паўлава, каля Палаца моладзі. Цяпер ідзе мантаж ёлак на Кастрычніцкай плошчы, каля Нацыянальнай бібліятэкі і чыгуначнага вакзала. Слесары-мантажнікі «Мінскрэкламы» цёзкі Віталь ПЕХАЎ і Віталь ГРЫНЯВІЦКІ ўпрыгожваюць штучнымі галінкамі ёлку каля Нацыянальнай бібліятэкі. Робяць гэта з задавальненнем і з адчуваннем, што нясуць людзям добры настрой і прадчуванне свята.**

### «ЗВЯЗДА» ЕДЗЕ Ў ПІНСК

**Нарэшце мы дабяромся да сталіцы Палесся! Заўтра а 13-й гадзіне ў паштовым аддзяленні №8 горада Пінска (вул. Брэсцкая, 85) «Звязда» правядзе Дзень падпісчыка.**

Мы рады будзем сустрэцца з нашымі чытачамі, а таксама з тымі, хто пакуль нерэгулярна чытае нашы выданні. Раскажам пра сябе і з задавальненнем выслухаем вас: што вам, чытачам, хацелася б бачыць на старонках газеты, якія цікавыя падзеі адбываюцца ў жыцці роднага горада, вёскі або нават у сям'і, якія праблемы вас турбуюць, дзе неабходна ўмяшальніцтва «чацвёртай улады»... Мы заўсёды рады вас пачуць і асабліва прыемна будзе пазнаёміцца асабіста. Прыходзьце! Будзе цікава і душэўна.

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# ПА ТОНКІМ ЛЁДЗЕ

## У лістападзе ў сцюдзёнай вадзе загінулі чатыры чалавекі

**Мінулая нядзеля сабрала крывавы ўраджай на беларускіх вадаёмах. Першая трагедыя адбылася на возеры Тарасава, што ў Бабруйскім раёне. А палове восьмай раніцы палавіць рыбу адправіліся бацька і сын. Абодва дарослыя людзі: 1958 і 1982 гадоў нараджэння. Лёд на возеры быў зусім тонкі — прыкладна тры сантыметры ў таўшчыню. А ў 15.05 на пульт дзяжурнага Бабруйскага райаддзела па надзвычайных сітуацыях паступіў званок аб бядзе. Пасля непрацяглых пошукаў ратаўнікі знайшлі ў палонцы целы двух рыбакоў. Да берага было каля трыццаці метраў...**

А ўвечары ў нядзелю паведамленне пра патанулага пенсіянера прыйшло да ратаўнікоў у Чавусах. 65-гадовы мужчына пайшоў на рыбалку. Прыкладна а дзясятай гадзіне вечара цела небаракі знайшлі ў палонцы за сем метраў ад берага. Адметна, што таўшчыня лёду і на гэтым вадаёме не перавышала тры сантыметры.

### «На вадаёмах хутчэй не лёд, а шуга»

Рыбакоў на неакрэплы лёд цягне меркаванне, што ў гэты час там будзе найлепшы клёў, — заўважае **вядучы спецыяліст рэспубліканскага савета Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА**. — Тое,



што вадаём замёрз літаральна дзень-два таму, іх нікольки не хвалюе. Думаюць: «Лёд жа нарос, значыць, вытрымае мяне». Хаця мінімальная таўшчыня лёду, здольная вытрымаць чалавека з невялікім грузам, складае 7 сантыметраў. Заэначу: аднаго чалавека. Калі ж у вандроўку па вадаёме выправіцца група людзей, якія знаходзяцца дастаткова блізка адно ад аднаго (на адлегласці прыкладна 5-6 метраў), то нагрузка на ледзяное пакрыва аўтаматычна павялічваецца з-за невялікай плошчы паверхні. Таму тут лёд не павінен быць танчэйшы ўжо за 12 сантыметраў.

СТАР. 2

■ Ініцыятыва

# ВЕЛАСІПЕДЫ І ЁГА — БЯСПЛАТНА

**У беларускай глыбінцы прыхільнікі здаровага ладу жыцця не проста агітуюць землякоў браць з іх прыклад. Яны арганізуюць бясплатны пракат веласіпедаў, праводзяць заняткі па фітнесе, ёзе, скандынаўскай хадзьбе. У рэалізацыі ідэй энтузіястам дапамагае Чырвоны Крыж. Карэспандэнт «Звязды» вывучыў адпаведны вопыт.**

### Самы правільны горад

Горад Горкі Магілёўскай вобласці першым у краіне далучыўся да Еўрапейскай сеткі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Вясной ён атрымаў сертыфікат «Здаровы горад».

— Гэта, безумоўна, нагода для гонару. У нас актывісты бясплатна вучаць скандынаўскай хадзьбе. Ёсць экалагічная сцежка «Прыгажосць Горацкага краю». На імправізаваным пункце здароўя арганізуецца



**Удзельнікі ініцыятыўнай групы ў Сянно дэманструюць майстар-клас па спартыўных танцах.**

### Здаровым быць модна і выгадна

трэнінг для тых, хто хоча пазбавіцца ад шкодных звычак, навучыцца правільна харчавацца. Да паслуг гараджан — спартыўная і дзіцячая пляцоўкі на тэрыторыі коннаспартыўнай школы, — расказвае рэгіянальны **каардынатар адпаведнага праекта Чырвонага Крыжа Таццяна БАРАВІКОВА.**

Ніякіх фінансавых бонусаў статус «Здаровы горад» не дае. Але само здароўе даражэйшае за любыя грошы. Асаблівасць Горак у тым, што прыкладна трэць гараджан — студэнты. І іх каля 10 тысяч. Энтузіясты плённа займаюцца з моладдзю.

СТАР. 2

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### Трамп расказаў аб планах на першыя 100 дзён прэзідэнцтва

Так, паводле слоў абранага прэзідэнта, ЗША выйдуць з Трансціхаакіянскага гандлёвага партнёрства (ТГП). Як заяўляе Дональд Трамп, замест пагаднення паміж 12 дзяржавамі будуць заключацца «сумленныя двухбаковыя здзелкі, якія вернуць працоўныя месцы і вытворчасць у Амерыку». Таксама ў відэазвароце было заяўлена аб распараджэнні міністэрству абароны супрацьстаяць розным формам нападаў, а таксама падрыхтаваць план па абароне важнай інфраструктуры ад кібератак і іншых пагроз. У вобласці міграцыйнага заканадаўства кіраўнік дзяржавы паабяцаў правесці расследаванне ўсіх выпадкаў парушэнняў візавага рэжыму. Плануецца адмяніць абмежаванні на вытворчасць вуглевадародаў, у тым ліку на распрацоўку шэльфавых радовішчаў. Для афіцыйных асоб уводзіцца пяцігадовая забарона на лабізм у ЗША і пажыццёвая — на лабізм ад імя замежных урадаў.

### Меркель ідзе на чацвёрты тэрмін, Сарказі выбывае з прэзідэнцкай гонкі

Канцлер Германіі Ангела Меркель, выступаючы перад прэсай у Берліне, зрабіла заяву. Як перадаюць інфармагенцтвы, яна афіцыйна абвясціла пра свой намер балатавацца на чацвёрты тэрмін у будучым годзе. «Я разважала пра гэта бясконца доўга. Рашэнне ісці на чацвёрты тэрмін пасля 11 гадоў у крэсле канцлера — нетрывіяльная задача», — сказала Меркель. Парламенцкія выбары, па выніках якіх стане зразумела, хто зойме пасаду канцлера, пройдуць у Германіі ў канцы лета або восенню наступнага года.

Тым часам экс-прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі пакінуў прэзідэнцкую гонку. На першасных выбарах 61-гадовы Сарказі, які лічыўся адным з фаварытаў, саступіў сваім супернікам.

### Дзярждэп папярэдзіў аб магчымасці тэрактаў у Еўропе

Дзярждэпартамент ЗША папярэдзіў амерыканскіх грамадзян аб павышанай рызыцы тэрарыстычных нападаў на тэрыторыі Еўропы, асабліва ў час свят. Згодна з інфармацыяй ведамства, тэрарыстычныя групоўкі «Ісламская дзяржава» і «Аль-Каіда», а таксама іх філіялы працягваюць планаваць атакі ў еўрапейскіх краінах. У ведамстве заклікалі грамадзян ЗША захоўваць асцярожнасць. Гэтая перасцярога дзейнічае да 20 лютага 2017 года. Паводле звестак дзярждэпартамента, небяспека можа зыходзіць не толькі ад вышэйзгаданых груповак, але і ад дамарослых тэрарыстаў, «якія спачуваюць экстрэмістам». «Баевікі могуць прымяняць самыя разнастайныя тактыкі з выкарыстаннем як традыцыйных, так і нетрадыцыйных відаў узбраення», — заявілі дыпламаты, удакладніўшы, што экстрэмісты могуць выбіраць сваімі мішэнямі як службовых асоб, так і простых людзей.

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Песімізм павялічвае верагоднасць смерці

Упэўненасць у тым, што ў будучыні не чакае нічога добрага, павышае ўзровень цукру ў крыві і артэрыяльны ціск. Таму спецыялісты з Фінляндыі раяць пазітыўна глядзець на рэчы. У даследаванні ўдзельнічалі 2267 мужчын і жанчын ва ўзросце ад 52 да 76 гадоў. За ўдзельнікамі сачылі больш за 11 гадоў, піша The Daily Mail. Даследчыкі прааналізавалі звесткі аб сацыяльна-эканамічным статусе, псіхасацыяльным фоне, ладзе жыцця, узроўні цукру ў крыві, артэрыяльным ціску, хваробах добраахвотнікаў. Таксама навукоўцы ацанілі ўзроўні аптымізму і песімізму ўдзельнікаў. За час даследавання 121 чалавек памёр ад хвароб сэрца. Даследаванне паказала: у людзей, якія памерлі ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, узроўні песімізму апынуліся істотна вышэйшымі ў параўнанні з тымі, хто застаўся жывы. У цэлым удзельнікі з самымі высокімі ўзроўнямі песімізму паміралі ад хвароб сэрца ў 2,2 раза часцей добраахвотнікаў з сярэднімі ўзроўнямі песімізму.

## КОРАТКА

**Нацыянальны навукова-тэхналагічны парк «БелБіяград» пачне працаваць у Беларусі ў 2017 годзе. Галоўнай задачай тэхнапарка з'яўляецца развіццё высокіх навукаёмістых галін, звязаных з мікрабіялогіяй, а таксама нанаматэрыяламі і нанатэхналогіямі.**

Беларусь і Расія абмяркоўваюць праект пагаднення аб узаемным прызнанні віз. Сёння жадаючыя трапіць у Расію павінны перасякаць граніцу пры наяўнасці дзеючай візы і праз міжнародны пункт пропуску.

**Адкрытае праслухоўванне прэтэндэнтаў нацыянальнага адбору Міжнароднага конкурсу «Еўрабачанне-2017» адбудзецца ў Белтэлерадыёкампаніі 30 лістапада. Яно пройдзе ў рэжыме жывога гуку ў суправаджэнні музыкі і (або) фанаграмы, запісанай без вакалу любога віду або нейкіх вакальных імітацый.**

Больш як 40 «бензавозаў» развярнулі польскія пагранічнікі за тыдзень з-за частых выездаў за мяжу з поўным бакам. Аўтамабілі выязджалі часцей за адзін раз у 72 гадзіны.

**У студзені-кастрычніку 81,5% грамадзян не перавысілі льготныя аб'ёмы электраспажывання, устаноўленыя ўрадам.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Цаню педантычную дакладнасць і аператыўнасць»

**Алена НЕСЦЯРОНАК, дырэктар плацежнай сістэмы «Белкарт»:**



— Ваша газета нясе, безумоўна, асветніцкую і адукацыйную функцыю. Калі коратка, то я б сказала пра яе так: актуальна, аператыўна і прафесійна. Выданне здолела заваяваць чытацкую любоў і прызнанне. Сёння — гэта ўнікальная штодзённая газета са сваімі традыцыямі і невычэрпным патэнцыялам развіцця. Творчы падыход да справы, дынамічны стыль працы і ўвага да новых ідэй адрозніваюць калектыў аднадумцаў і прафесіяналаў.

**Запісаў Сяргей КУРКАЧ.**

ISSN 1990 - 763X

16226>

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА, 5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# СТАЎКА НА ІНТЭЛІГЕНЦЫЮ

## Асветніцкая работа зноў актуальная

**Учора прайшло пашыранае пасяджэнне прэзідыума праўлення Беларускага таварыства «Веды».**

**Як паведаміў старшыня праўлення арганізацыі Генадзь ПАЛЬЧЫК, «Веды» плануюць больш актыўна прыцягваць у свае шэрагі калектывы арганізацый. Напрыклад, кіраўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук ужо пацвердзіла сваю гатоўнасць увайсці ў склад таварыства «Веды» як калектыўны член і тым самым будзе забяспечваць кадравую падтрымку мерапрыемстваў.**

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ** адзначыў, што да мерапрыемстваў арганізацыі гатова падключыцца вялікая колькасць спікераў. Людзі імкнуцца прымаць удзел у грамадска-палітычным, інтэлектуальным, творчым жыцці грамадства. Пляцоўкай для іх могуць служыць лекцыі, семінары, канферэнцыі гэтага грамадскага аб'яднання. Такім чынам, яно можа ўдзельнічаць у фарміраванні творчай інтэлектуальнай эліты грамадства, падкрэсліў Ігар Бузоўскі.

«Таварыству «Веды» неабходна да гэтага імкнуцца як арганізацыі з даўно сфарміраваным брэндам, які павінен спрацаваць і на перспектыву. Ён не растрачаны і мае каласальны рэсурс», — сказаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта і дадаў, што ў цяперашні няпросты час, калі мяняюцца каштоўнасныя арыенціры, падыходы да аналізу працэсаў у Беларусі і за мяжой, запатрабаваныя кампетэнтныя, прафесійныя лектары, якія могуць гэтыя працэсы растлумачыць. Пры гэтым важна, каб іх лекцыі былі цікавыя для аўдыторыі. Ігар Бузоўскі звярнуў увагу на неабходнасць актуалізацыі такога паняцця, як інфармацыйна-асветніцкая работа, для чаго таксама неабходныя прафесійныя прамоўцы.

Падчас пасяджэння гаворка ішла аб удасканаленні формаў удзелу грамадства ў інфармацыйна-асветніцкай рабоце, пытаннях фінансавання дзейнасці грамадскага аб'яднання, паведамляе БЕЛТА. Разглядаліся перспектывы сумесных грамадска значных праектаў таварыства «Веды» з дзяржаўнымі структурамі і арганізацыямі. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел старшыні праўленняў абласных структур грамадскага аб'яднання, міністр інфармацыі Лілія Ананіч, міністр культуры Барыс Святлоў.

Сёння ў структуру Беларускага таварыства «Веды» ўваходзіць 6 абласных, 8 гарадскіх, больш за 120 раённых арганізацый, якія аб'ядноўваюць звыш 15 тысяч членаў. Асветніцкая і адукацыйная дзейнасць уваходзіць у лік прыярытэтаў грамадскага аб'яднання.

Таварыства «Веды» садзейнічае прапагандзе нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця, інфармуе насельніцтва аб дзейнасці дзяржорганаў, палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці.

■ Партнёры

# РАЗАМ — СУПРАЦЬ ФАЛЬСІФІКАЦЫІ ГІСТОРЫІ

## Калегія МЗС Беларусі і Расіі абмеркавала далейшае супрацоўніцтва

**Сумеснае пасяджэнне калегій дыпламатычных ведамстваў нашай краіны і Расіі прайшло ў Мінску. Быў разгледжаны шэраг аспектаў двухбаковага ўзаемадзеяння на міжнародных пляцоўках — работа ў МАГАТЭ, чарнобыльская праблематыка, устойлівае развіццё, правы чалавека. Як заявіў журналістам па выніках пасяджэння Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў нашай краіны, Беларусь і Расія «праводзяць узгодненую лінію па гэтых напрамках, канструктыўная і цесная работа з расійскім бокам ва ўсіх даступных фарматах будзе працягнута».**

«У кантэксце абмеркавання еўрапейскай праблематыкі, у прыватнасці, нашых адносін з Еўрасаюзам, хачу адзначыць, што Беларусь працягне адстойваць пазіцыю аб недапушчальнасці прымусу краін-партнёраў да выбару паміж еўразійскай і еўрапейскай інтэграцыяй. Зыходзім з таго, што Еўрасаюзу неабходна ўлічваць інтарэсы «суседзяў суседзяў» — сумежных з краінамі «Усходняга партнёрства» дзяржаў, уключаючы Расію», — падкрэсліў кіраўнік нашага дыпламатычнага ведамства.

Асаблівую ўвагу падчас дыскусіі дыпламаты ўдзялілі праблематыцы Еўразійскага эканамічнага саюза, у тым ліку пытанням наладжвання ўзаемадзеяння ЕАЭС з іншымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі. «У сувязі з гэтым абмеркавана тэма выбудоўвання прагматычных і доўгатэрміновых адносін паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і Еўрасаюзам, — праінфармаваў Уладзімір Макей. — Нашым інтарэсам таксама адпавядае спалучэнне Еўразійскага эканамічнага саюза з кітайскай ініцыятывай эканамічнага пояса Шаўковага шляху і наладжванне канструктыўных кантактаў паміж саюзам і АСЕАН».

Яшчэ адным важным прадметам размовы на сумесным пасяджэнні калегій МЗС Беларусі і Расіі стала сумеснае процідзеянне спробам фальсіфікацыі гісторыі і перагляду вынікаў Другой сусветнай вайны, паведамляе БЕЛТА. «Мы дамовіліся актывізаваць нашы сумесныя намаганні на гэтым напрамку, у тым ліку на пляцоўках міжнародных арганізацый, — паведаміў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства нашай дзяржавы. — Абарона агульных каштоўнасцяў і ідэалаў — гэта наш святы абавязак перад ветэранамі і гістарычнай памяццю беларускага і расійскага народаў».

У сваю чаргу **Сяргей ЛАЎРОЎ, міністр замежных спраў Расіі**, адзначыў канструктыўны характар сустрэчы. «Мы змаглі забяспечыць сапраўды саюзніцкі характар нашых адносін, паказаць усе перавагі, звязаныя з паступальным зблізжэннем», — сказаў ён.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
**Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62**

**Продавец:** ООО «Винреал», Витебская обл., Витебский р-н, аг. Новка, ул. Рудаковская, 7, (0212) 47-75-96

Лот №1. Капитальное строение с инв. №200/С-46898 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Рудаковская, 7, площадь – 2509 кв.м, назначение – производственный корпус, наименование – производственный корпус; изолированное помещение с инв. №200/D-83157 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Рудаковская, 7-1, площадь – 259 кв.м, назначение – производственное помещение, наименование – купажное отделение цеха розлива, расположенные на зем. участке с кадастровым №221287012101000469 площадью 0,9048 га (долевая аренда). Капитальное строение с инв. №200/С-82061 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Рудаковская, линия электропередач к территории ООО «Винреал», назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия электропередачи, расположенное на зем. участках с кадастровыми №№ 221287012101000716, 221287012101000753, 221287012101000717, 221287012101000720, 221287012101000722, 221287012101000719, 221287012101000718. Ограждение с 3-мя воротами, технологическое оборудование в количестве 210 ед. **Нач. цена (с учетом/до деноминации):** 916 277/9 162 770 000 бел. руб. без НДС. **Задаток (с учетом/до деноминации):** 91 627,70/916 277 000 бел. руб. **Шаг аукциона (с учетом/до деноминации):** 45 814/458 140 000 бел. руб.

Торги состоятся **26.12.2016 г. в 11.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи заявлений на участие в торгах: **с 23.11.2016 с 8.30 по 23.12.2016 до 17.30**. Задаток перечисляется на р/с 3012412231013 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области г. Витебск, код 739. Получатель платежа: ООО «Винреал». Движимое имущество находится по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Рудаковская, 7

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. **Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

# ПАДТРЫМАЦЬ ЛЮДЗЕЙ

## На пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях прапанавалі ўвесці два новыя віды страхоўкі

**Сітуацыя на рынку працы зараз паддаецца кіраванню, як заяўляюць спецыялісты, але тым не менш застаецца няпроста. У гэтых умовах дзяржава і грамадства спрабуюць знайсці спосабы падтрымаць беспрацоўных. У прыватнасці, спецыялісты лічаць, што ў такім выпадку можа дапамагчы страхаванне. І прапаноўваюць два новыя віды страхоўкі, якія змогуць забяспечыць на нейкі час прымальныя ўмовы жыцця людзям, якія страцілі работу, і іх сем'ям — пакуль чалавек не знойдзе новае працоўнае месца.**

### Калі чалавек зарабіў грошы, ён павінен іх атрымаць

Цяпер сустракаюцца выпадкі, калі прадпрыемства, якое становіцца банкрутам, не можа даць сваім работнікам належныя выплаты.

— Прафсаюзы выступаюць за тое, што калі чалавек сапраўды зарабіў грошы, то ён павінен іх атрымаць, — гаворыць **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА**. — Таму мы ўнеслі прапанову, як можна кампенсаваць людзям заробак, калі прадпрыемства звярнулася да працэдуры банкруцтва. Для гэтага неабходна ўвесці страхаванне на выпадак страты заробку з-за неплацежаздольнасці (банкруцтва) наймальніка.

**По даручэнні ўрада створана міжведамасная рабочая група для выпрацоўкі прапаноў аб стварэнні сістэмы страхавання ад беспрацоўя і яе прымяненні з 2018 года, а таксама аб мэтазгоднасці ўвядзення ў краіне сістэмы страхавання рызыкі нявыплаты заработнай платы пры банкруцтве арганізацыі. Прапановы павінны быць прадстаўлены ў Савет Міністраў да 1 лютага 2017 года.**

У эканоміцы гэта нармальная сітуацыя, калі нейкае прадпрыемства звяртаецца да працэдуры банкруцтва. Гэта дае яму магчымасць прайсці санацыю і аздаравіцца, у тым ліку прайсці мадэрнізацыю, каб зноў пачаць працаваць. Альбо на месца гэтага прадпрыемства прыйдзе іншае, больш моцнае. Такія законы эканомікі, і яны працуюць аднолькава ва ўсіх краінах. Але самае галоўнае пры гэтым, каб работнікі такога прадпрыемства былі сацыяльна абароненыя, лічыць старшыня ФПБ.

Міхаіл Орда перакананы, што ўвядзенне страхавання на выпадак страты заробку з-за банкруцтва наймальніка значна палепшыць сацыяльную абарону работнікаў. Такое страхаванне дасць магчымасць работніку атрымаць грошы, за якія ён можа жыць. Для выплаты кампенсацый людзям, на думку Міхаіла Орды, неабходна стварыць спецыяльны фонд. Сфарміраваны пры ім савет будзе разглядаць кожны выпадак і вызначаць памер выплат (напрыклад, можна кампенсаваць не толькі неатрыманую зарплату, але і нявыкарыстаны работнікам адпачынак) і г. д. Мяркуецца, што ў савет фонду будуць уваходзіць тры бакі — урад, наймальнікі і прафсаюзы. Гэтую прапанову ФПБ накіравала кіраўніку дзяржавы, які даў даручэнне ўсім бакам дэталёва разгледзець пытанне.

### З 2018 года пачне прымяняцца страхаванне ад беспрацоўя

Паводле маніторынгу, які правяло Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, на сёння залішняя колькасць персаналу арганізацый перавышае 5%. А значыць, каб гэтыя прадпрыемствы працавалі эфектыўна, не абысціся без іх рэструктурызацыі і аптымізацыі колькасці работнікаў. У сваю чаргу гэта прыводзіць да таго, што неабходныя мерапрыемствы па ўмацненні сацыяльнай абароны беспрацоўных. У якасці адной з такіх мер спецыялісты прапануюць увядзенне абавязковага страхавання ад беспрацоўя.

Мэта страхавання па беспрацоўі, на думку **начальніка ўпраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алега ТОКУНА**, — забяспечыць прымальныя ўмовы жыцця для значнай часткі беспрацоўных на той момант, пакуль яны будуць шукаць новае месца працы. З улікам дадатковых сацыяльных ільгот, у прыватнасці сямейных дапамог, жыллёвых субсідый, узровень замяшчэння даходаў сям'і беспрацоўнага можа дасягаць 70—90% страчанага заробку.

**Плануецца павысіць дапамогу па беспрацоўі да 100% БПМ звольненым у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў, да 50% БПМ — іншым работнікам, якіх звольнілі па ўважлівых прычынах.**

Дарэчы, Алег Токун падкрэслівае, што высокая дапамога павінна суправаджацца жорсткімі патрабаваннямі — так прынята ў большасці краін. Для атрымання права на дапамогу па беспрацоўі павінны быць выкананыя пэўныя ўмовы. Па-першае, работнік павінен быць застрахаваны на апошнім працоўным месцы, і за яго павінны паступаць унёскі. Па-другое, на выплату дапамогі можа паўплываць прычына скасавання працоўнага кантракта, напрыклад, звольніўся работнік па ўласным жаданні ці быў звольнены. Па-трэцяе, абавязковым патрабаваннем застанецца рэгістрацыя ў дзяржаўнай службе занятасці. І, безумоўна, захаваецца патрабаванне актыўнага пошуку работы або ўдзелу ў праграмах перанавучання. Усё гэта — абавязковая ўмова для эфектыўнага функцыянавання сістэмы страхавання па беспрацоўі, лічыць прадстаўнік Мінпрацы і сацабароны.

У якасці пераходнай прыступкі да сістэмы страхавання ў цяперашні час разглядаецца павышэнне памеру дапамогі па беспрацоўі асобным катэгорыям беспрацоўных. Гэтая мера разлічана на кароткатэрміновы перыяд — да моманту фарміравання страхавога фонду ад беспрацоўя і назапашвання неабходнай колькасці сродкаў. Так, плануецца павысіць дапамогу па беспрацоўі да 100% бюджэту пражытковага мінімуму (далей — БПМ) звольненым у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў, да 50% БПМ — іншым работнікам, якіх звольнілі па ўважлівых прычынах. Адпаведны праект указа ўжо распрацаваны Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны і падтрыманы міністэрствамі эканомікі і фінансаў. А ў рэспубліканскім бюджэце запланаваны неабходныя для гэтага фінансавыя рэсурсы.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## АДЧУЦЬ ДАПАМОГУ

**У суботу пройдуць чарговыя прамыя тэлефонныя лініі. На званкі жыхароў краіны адкажуць кіраўнікі гарадоў, раёнаў і абласцей, разам яны пастараюцца знайсці шляхі выхаду з праблемных сітуацый**

Тэлефонныя лініі 26 лістапада з 9.00 да 12.00 правядуць:

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
старшыня КРАЎЦОЎ Уладзімір Васільевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні МАЛАШКА Валерый Анатольевіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).

■ Змена статусу

# ГАРАДОЎ СТАНЕ БОЛЬШ

**Савет Міністраў даў згоду на наданне Бялынічам і Кругламу статусу гарадоў раённага падпарадкавання.**

Адпаведны дакумент 17 лістапада падпісаў прэм'ер-міністр краіны Андрэй Кабякоў, днямі пастанаўленне было апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Раней абодва населеныя пункты, што з'яўляюцца адміністрацыйнымі цэнтрамі раёнаў, лічыліся пасёлкамі гарадскога тыпу. Цяпер у Бялынічах пражывае больш за 10 тысяч чалавек, у Круглым — больш як 7,5 тысячы. Пасля афіцыйнага надання ім статусу гарадоў, колькасць такіх населеных пунктаў у Беларусі ўзрасце да 115. Цяпер у краіне іх налічваецца 113, самы маленькі — Дзісна ў Мёрскім раёне Віцебскай вобласці, там пражывае ўсяго каля 1,5 тысячы чалавек.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# ПА ТОНКІМ ЛЁДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Маразы, якімі пачаўся лістапад, крыху скавалі вадаёмы. Але нават і лёдам назваць гэта не атрымліваецца. Хутчэй гэта шуга — дробная рыхлая маса, якая з'яўляецца ў самым пачатку ледаставу. У ёй вельмі шмат прамоін, ёсць і такія ўчасткі, дзе ўвогуле засталася адкрытая вада.

Для таго каб на паверхні рэк і азёраў сфарміраваўся сапраўдны лёд, ртутны слупок тэрмометра мусіць не падымацца вышэй за мінус 1-2 градусы на працягу сама меней тыдня. І яшчэ не факт, што таўшчыня лёду дойдзе за гэты час да бяспечнай. А цяпер згадайце, якое надвор'е стаяла ў лістападзе: уначы мароз крыху прыхопіць, а ўдзень тэмпература падымаецца да нулявой адзнакі. Дзе ж тут нарасці лёду? Утрымаць хаця б тое, што ўжо ёсць.

**Сёлета з падлёднай рыбалкі дадому ўжо не вярнуліся 8 чалавек. За ўвесь мінулы год патанулі 12 рыбакоў.**

Да таго ж такі малады лёд будзе вельмі неаднародны па кансістэнцыі. Ніз, які кантактуе з халоднай вадой, будзе яшчэ сяк-так трымацца. Зверху ж, пад уплывам сонечнага выпраменьвання і плюсавых тэмператур, снег пачне пакрысе адыходзіць. А ноччу «прыхопіць» мароз. Так у лёдзе ўтвараюцца поласці. Што, зразумела, не ўплывае станоўча на яго моцнасць.

Як даведацца аб таўшчыні лёду? Рыбакам прасцей — у іх ёсць спецыяльны бур. А вось тым, хто адпраўляецца на вадаём для прагулкі на лыжах ці проста для таго, каб скараціць шлях, трэба абавязкова ўзброіцца палкай. Моцнымі ўдарамі па лёдзе трэба паспрабаваць прабіць дзірку перад сабой. Калі гэта ўдалося і вада плёскаецца падазрона блізка ад паверхні, трэба вельмі асцярожна даваць задні ход да берага.

— Трэба мець на ўвазе, што вада замярзае ў напрамку ад берага да цэнтра вадаёма, — працягвае Алег Баразна. — На рэках, дзе ёсць плынь і могуць быць водавароты, а таксама непадалёк ад прамысловых прадпрыемстваў таўшчыня лёду будзе меншай. Адпаведна, на стаячых вадаёмах ён утворыцца хутчэй.

Лёд і сам можа «падказаць», трывалы ён ці не. Добрае, моцнае покрыва мае звычайна яркі белы колер, які іскрыцца на сонцы. Калі ж яно пачынае разбурацца ці мае схаваныя поласці, то колер зменіцца на брудна-шэры.



### Сакрэты правільных паводзін

Калі чалавек праваліўся пад лёд, то ўсё, на што ён можа разлічваць, — гэта пяць хвілін для выратавання. Менавіта столькі часу праходзіць да поўнага акачанення мышцаў. Гэты паказчык можа нязначна вар'іравацца ў залежнасці ад канстытуцыі чалавека і вопраткі. Зімовая куртка дасць дадаткова некалькі секунд на тое, каб зберагчы цяпло цела, але разам з тым і скуе рухі ў вадзе.

Даводзілася сутыкацца з думкай, што шанцы на тое, што лёд вытрымае чалавека на лыжах, вышэйшыя ў параўнанні з тым, хто па лёдзе ідзе пешшу.

— Гэтае меркаванне памылковае, — тлумачыць Алег Баразна. — Так, лыжы створаць крыху большую плошчу апоры. Але істотным гэты паказчык назваць нельга. Размеркаванне вагі будзе такое ж нязначнае. І таму, калі лёд нармальна не сфармаваўся, то не дапамогуць і лыжы.

Ёсць свае сакрэты і ў тым, як правільна трэба зімовым рыбаловам бурыць лункі на лёдзе. Адлегласць паміж імі павінна быць не меншая за метр. Калі ж дзіркі насвідраваць шчыльна адну каля адной, то структурная цэласнасць ледзянога покрыва ў гэтым месцы будзе незваротна парушана. Пад дадатковым цяжарам масы цела рыбака можа ўтварыцца трэшчына, якая пашыраецца лавінападобна. І чалавек, які захацеў дабрацца дадому з большым уловам, рызыкуе з гэтай рыбалкі не вярнуцца.

— Мы настойліва рэкамендуем адпраўляцца на лёд з індывідуальным сродкам самавыратавання, — кажа Алег Баразна. — Гэта можа быць дубец, шэст, жардзіна. Галоўнае, каб на яго можна было абаперціся і пакрысе выбрацца. Ёсць і спецыяльныя прыёмы, якія дапамогуць вылезці з палонкі. Напрыклад, пры нязручнасці скінуць верхнюю вопратку, перавярнуцца на спіну, уперціся нагамі ў дальнюю кромку, раскінуць рукі ў розныя бакі і, адпіхваючыся нагамі, перакатамі выбрацца на лёд. Калі вылезці самому на лёд не атрымліваецца, не варта саромецца клікаць на дапамогу. Для ратавальніка вельмі важна не ўступаць у непасрэдны кантакт з чалавекам, які церпіць бедства. Падаць можна шалік, куртку, дубец — адным словам, усё, што знойдзецца, каб толькі выцягнуць чалавека з вады. І тут жа неадкладна выклікаць хуткую дапамогу, бо знаходжанне ў вадзе зімой гарантуе пераахаладжэнне арганізма.

### Штрафаў за выхад на неакрэплы лёд няма. Пакуль што

Два гады таму беларускі сегмент сеціва «ўзарвала» інфармацыя аб тым, што ў краіне могуць увесці грашовае пакаранне для тых людзей, каго злавілі на тонкім лёдзе на вадаёмах. Як жа ідуць з гэтым справы цяпер?

— На заканадаўчым узроўні гэтая норма пакуль што не замацавана, — гаворыць Алег Баразна. — Выканаўчыя і распарадчыя органы, якім падначалены водныя аб'екты, могуць забараняць выхад на іх падчас ледаставу ці актыўнага разбурэння. Гэта рашэнне лакальнае, носіць прафілактычны характар, але не цягне за сабой накладанне штрафу.

Некаторыя людзі лічаць, што выцягнуць 2-3 рыбкі з-пад лёду на вадаёме — гэта вялікае задавальненне. Але няўжо яно даражэйшае за жыццё?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

# ВЕЛАСІПЕДЫ І ЁГА — БЯСПЛАТНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Хлопцы, дзяўчаты ведаюць, што не курыць і не злоўжываць спіртным недастаткова. Трэба кантраляваць вагу, ведаць як правільна харчавацца. А калі ўжо ў паход — дык табу на тытунь і спіртное, — дадае **кіраўнік групы «Пачнём з сябе» Дзмітрый ФІЯЛКА, выкладчык кафедры фізкультуры і спорту Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі** (знаходзіцца ў Горках).

Старшыня гарвыканкама асабіста падтрымлівае ўсё, што спрыяе здароўю землякоў. І гэта — трэнд у дзейнасці мясцовай улады.

### Грошы не патрэбныя

У Сенненскім раёне дзясяткі дарослых, дзякуючы валанцёрам, навучыліся катацца на веласіпедзе. У гарадскім пасёлку Багушэўск (цэнтр сельсавета паміж Віцебскам і Оршай) бясплатна напракат бяруць «колы». Усяго веласіпедаў каля 20. У тым ліку і для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Неабходнасць у такой паслузе высветлілася падчас апытання мясцовых жыхароў. Маўляў, купіць экалагічны транспартны сродак пакуль не па кішэні, а ездзіць на ім хочацца. Да інструктара, які вучыць яздзе, літаральна выстройваецца чарга. Па веласіпеды прыходзяць і жыхары суседніх населеных пунктаў.

У Ходцах з медыцынскай амбулаторыі часта накіроўваюць пацыентаў у трэнажорную залу. Там займаюцца і супрацоўнікі сельвыканкама, як і жыхары суседніх вёсак. За аздараўленне і тут плаціць не трэба. Акрамя таго, падчас заняткаў можна паглядзець відэафільм пра гімнастычныя практыкаванні для людзей усіх узростаў.

У райцэнтры Сянно нядаўна прайшлі абласныя «Дажынкі». Сярод іншых аб'ектаў сацыяльнага прызначэння адкрылі і фізкультурна-аздараўленчы комплекс. У хуткім часе да паслуг людзей будзе і бясплатная трэнажорная зала — таксама ў цэнтры горада. Прыхільнікі здаровага ладу жыцця бясплатна прапануюць займацца і ёгай.




**Горацкая раённая арганізацыя Чырвоны Крыж праводзіць трэнінг для валанцёраў па прафілактыцы неінфекцыйных захворванняў.**

— Пасля года заняткаў людзі адзначылі, што адчулі сябе не толькі больш здаровымі — ім стала лягчэй працаваць, прайшлі лёгкія дэпрэсіі, жыццё заззяла новымі гранямі, — расказвае **кіраўнік ініцыятыўнай групы «Вясёлка», галоўны ўрач Сенненскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Сняжана МЯЦЕЛІЦА**.

Сярод «вучняў» у школе здаровага ладу жыцця — людзі розных узростаў, але большасць — пенсіянеры.

### «Здаровая Зялёнка»

У аграрным гарадку з прыгожай назвай Зялёнка (Полацкі раён) мясцовай славутасцю стала «пляцоўка здароўя». На вуліцы штодня качаюць прэс і іншыя групы мышцаў, як кажуць, і стары, і малы. Вопытныя фізкультурнікі вучаць пачаткоўцаў займацца больш эфектыўна.

— Не сакрэт, што ў бюджэце сельскіх выканаўчых камітэтаў лішніх грошай няма. І добра, што Чырвоны Крыж зрабіў нам такі цудоўны падарунак. У нас вельмі актыўна працуе валанцёрская група «Здаровая Зялёнка», рэалізуецца міні-праект «Актыўны адпачынак усёй сям'ёй», — расказвае **Ала ЛАПАНОВІЧ, старшыня Зялёнкаўскага сельвыканкама**.

А ў турыстычнай сядзібе ў вёсцы Булаўкі прапануюць папраўіць здароўе пчаліным біяполем. Там жа распавядуць пра пчол і мёд, як мовяць, «ад «а» да «я». Такім чынам, атрымаўся ўнікальны кластар для аматараў нетрадыцыйных метадаў лячэння.

### Вопыт для іншых рэгіёнаў

Аказваецца, ініцыятыву з глыбінкі наконт уважлівых адносін да ўласнага арганізма могуць падтрымаць і на міжнародным узроўні. Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа сумесна са Швейцарскім Чырвоным Крыжам з 2014 года рэалізуе праект «Уцягванне супольнасцяў у прасоўванне здаровага ладу жыцця». Партнёрамі сталі Міністэрства аховы здароўя, Рэспубліканскі Цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя (і іх структуры і ўстановы). Далучыліся таксама іншыя дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі.

— Праект мае на ўвазе актыўны ўдзел супольнасцяў. Ён накіраваны на мабілізацыю людзей, каб папулярызаваць здаровыя адносіны да саміх сябе. І гэта зроблена шляхам стварэння ініцыятыўных валанцёрскіх груп, — тлумачыць **PR-спецыяліст праекта Наталля ГАНЦІЕЎСКАЯ**.

У цяперашні час створаны і актыўна працуюць 14 ініцыятыўных груп: каля 200 чалавек у 12 населеных пунктах у Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях.

— Праз раённыя аддзяленні Чырвонага Крыжа распаўсюджана інфармацыя пра праект. І ўсе, напрыклад, сельскія выканкамы, маглі далучыцца да яго. Практыка паказвае, што ініцыятыва падтрымліваецца. І самае галоўнае, што жыхары глыбінкі ў выніку атрымліваюць магчымасць бясплатна аздараўляцца, — каментуе **старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Галіна ЖЭЛАНАВА**.

Так на Беларусі становіцца модным адмова ад тытуню і алкаголю, своечасовае і правільнае харчаванне, фізічная актыўнасць. Мы можам самі зрабіць сваё жыццё доўгім і шчаслівым.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# НЕ ПЕШАХОД, А «ПАЎЗАХОД»

**Траса М1 — галоўная аўтадарожная магістраль нашай краіны — шмат чаго бачыла на сваім вяку. Але каб чалавек паўзком спрабаваў пераадолець адлегласць ад бліжэйшай вёскі да абласнога цэнтра! Такога нават бывалыя даішнікі не прыгадваюць. Менавіта ў бок горада ад вёскі Тэльмы на чатырох канечнасцях рухаўся па другой паласе знакамітай алімпійкі грамадзянін каля васьмі вечара.**

Чалавек поўз, а машыны міналі рухомае цела. І колькі тых машын заставалася да бяды, ніхто цяпер не ведае. Але, на шчасце, «паўзахода», заўважылі з машыны маладыя мінчане, якія ехалі ў Брэст са сталіцы. Яны спыніліся і дапамаглі мужчыну збочыць з праезнай часткі, таксама выклікалі ДАІ. Інспектарам яны расказалі, што літаральна перад імі тры машыны аб'ехалі незвычайнага ўдзельніка руху, і ніхто не спыніўся, каб папярэдзіць аварыю. У выпадку ДТЗ няшчасце напаткала б не толькі небараку, але і вадзіцеля, які панёс бы адказнасць за здарэнне.

Як паведамілі ў абласным упраўленні ДАІ, устаноўлена, што парушальнік, 54-гадовы брастаўчанін, знаходзіўся ў нецвярозым стане (1,7 праміле), да таго ж ён быў у вышуку за супрацьпраўныя дзеянні.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
23 лістапада 2016 г.
№ 19 (382)

СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЗ МЕЖАЎ

# ЕЎРАРЭГІЁНЫ: ЧАС ЗМЯСЦІЦЬ АКЦЭНТЫ

Надзея АНІСОВІЧ



**Наладзіць міжнароднае партнёрства паміж прыгранічнымі раёнамі — асноўная задача пяці еўрарэгіёнаў, якія размешчаны ўздоўж мяжы Беларусі. Трансгранічнае супрацоўніцтва, якое ўключае пашырэнне як сацыяльных, так і эканамічных сувязяў, становіцца адным з ключавых фактараў развіцця. Беларусь пачала ўдзельнічаць у стварэнні еўрарэгіёнаў з канца XX стагоддзя. Сёння гэтыя тэрыторыі — прыклад узаемадзеяння дзяржаў — удзельніц ЕС, ЕАЭС і Украіны на рэгіянальным узроўні. У чым каштоўнасць такога супрацоўніцтва, расказала менеджар праектаў Інфармацыйна-асветніцкай установы «Новая Еўразія» Людміла БАТУРА.**

***— Якія віды трансгранічнага партнёрства сёння найбольш запатрабаваныя?***

**Я паспрабую патлумачыць, што на кінафестывалі «Лістапад» здарылася цэлых адзінаццаць разоў. Увязаць гэтую лічбу з колькасцю карцін асноўнага ігравога конкурсу — занадта трафарэтна. Сказаць аб захапленні, страсцях і катарсісе — гучна. Праграма з адзінаццаці фільмаў стала своеасаблівым адбіткам рэальнасці і аказалася акурат «па ёй сшытай». Тут цябе тычыцца ўсё: тыповасць у антуражы, устойлівыя мутацыі свядомасці, узаемадзеянне з супярэчлівай сістэмай і яе ўплыў на асобу, спробы вызначыць уласнае «я». Вось ён, рэальны свет, вось — ты ў ім. Кіно, створанае ў датычных да агульнай ідэалогіі краінах, ажыццявіла татальную перапланіроўку рэчаіснасці, каб стаць нечым куды больш шматзначным. Тваё ўспрыманне небесстароннее, таму што за яго адказваюць у тым ліку вопыт пазнання і агульнае з аўтарамі калектыўнае несвядомае. Ты бачыш, як навакольны свет і кінематограф узаемапранікаюць, і ты тут — не адзіны назіральнік. Так, адзінаццаць разоў кіно паглядзела цябе.**

## Сэнсы

Можа быць, гэта і азбучная ісціна, тым не менш, паўтаруся: успрыманне фільмаў абумоўліваецца культурным кантэкстам. Як найлепшыя кнігі, па Оруэлу, кажуць пра тое, што мы ўжо ведаем, кіно становіцца крыху лепшым, калі на экране з'яўляюцца блізкія матэрыяльны свет, каштоўнасці і «сістэмы» (у самым шырокім сэнсе слова). Таму асабліва ашаламляльнымі і бліскучымі падаліся сямейныя сцэны ў цеснай кватэры «Сьераневады». Яркі эфект стварае неўсвядомленае супрацьстаянне «маленькага чалавека» пуцейца Цанка Петрава наладжанаму функцыянаванню міністэрства транспарту ў «Славе». Надзвычай пранізлівай становіцца «Анішаара», дзе асабістая драма галоўнай гераіні пагаршаецца водгукамі да агіды непрыгожага свету.

Ігравы конкурс «Лістапада» можа разглядацца якраз у гэтым рэчышчы — як кіраўніцтва па ўспрыманні і разуменні рэчаіснасці. Пакуль мы непрыкметна для сябе паддаемся рознага кшталту ўплывам, амаль усе фільмы наступствы гэтага кантакту з сістэмай агаляюць. Кіно ўжо даўно не трэба сцвярджаць сябе мастацтвам або спрабаваць прадставіцца сацыяльнай і палітычнай сілай, але, на жаль, публіка яшчэ з нацяжкай называе яго важным. Ігравы конкурс «Лістапада» як самадастатковы твор і карціны самі па сабе — менавіта важныя. Так, наш свет не выправіла нават фінальная прамова Чарльза Чапліна ў яго «Вялікім дыктатары», але мы не ведаем таксама, што было б, калі б яе не існавала.

Менавіта таму, што кожны фільм конкурсу стварае кантэкст і разглядаецца ў ім жа, можна апусціць, напрыклад, прыгнятальную аднамернасць карціны «Я, Вольга Гепнарава», змрочную безгустоўнасць фільма «Чума ў ауле Каратас» або гуллівую неперакандаўчасць «Дзён, што збілі з панталыку». Не важна і тое, што тытулаваныя румынскія карціны «Атэстат сталасці» Крысціяна Мунджыу і «Сьераневада» Крысці Пую сваёй славай засланілі іншых удзельнікаў. Ці тое, што ў конкурсе ёсць дэбютнае кіно, якое звычайна накіроўваецца ў «Маладосць на маршы». Адным словам, сапраўды важна толькі, які гэта ўсё нараджае сэнсавы фон.

## Незваротнасць

У ігравы конкурс патрапіла адразу дзве карціны, героі якіх маюць неадэкватную схільнасць да жорсткасці, — тая ж «Я, Вольга Гепнарава» Томаша Вайнрэба і Петра Казды і «Чырвоны павук» Марціна Кашалкі. Калі лічыць праграму пэўным адлюстраваннем свету, то канцэнтрацыя персанажаў-псіхаў — шматзначны акцэнт. У аснове чэшскай карціны — рэальная гісторыя Вольгі Гепнаравай, якая ў 1974 годзе была асуджана на смяротнае пакаранне за тое, што яна свядома накіравала грузавік на групу людзей і забіла ў выніку восем чалавек. Малады хлопец Караль Крэмер з «Чырвонага павука» выкрыў серыйнага забойцу і, сам нядзольны на жорсткасць, захапіўся крывавымі ўчынкамі новага знаёмага і выдаў сябе перад паліцыяй за вінаватага. Абедзве карціны быццам спрабуюць зразумець прычыны з'яўлення сацыяпатыі, мізантрапіі і садызму — толькі чэшская чорна-белая работа аддалася ракурсам і смакаванню вуглаватасці галоўнай гераіні, а польскі фільм стварыў для свайго персанажа цэлы аб'ёмны свет. Праз некалькі дзён пасля закрыцця фестывалю прагрымела навіна аб пскоўскіх школьніках, якія пасля стрэлаў па паліцэйскіх скончылі жыццё самагубствам. Пацвердзілася актуальнасць таго, што большасці з нас быццам і не тычыцца, але наваколле характарызуе — гэта быў амаль прароцкі акцэнт.

Сістэма стварае «монстра» — гэтым разам на вачах у гледача, па-мастацку ўмоўна — у фільме «Слава» Крысціны Грозевай і Петэра Вылчанава. Фільм «Урок» тых жа рэжысёраў узяў галоўную ўзнагароду мінулага «Лістапада». Калі ў папярэдняй карціне мы на трывожным надрыве адзіна ішлі за галоўнай гераіняй, то ў «Славе» раўназначных персанажаў два. А надрыў застаўся. Скрупулёзна прапісаная драматургія фільма наогул не ведае, што такое сузіральная перадышка. Нават у эпізодах, пазбаўленых мітуслівасці кіраўніка PR-службы міністэрства транспарту Юліі Стайкавай, мы ўсё роўна з унутраным непакоем чакаем вестак ад наступнай сцэны. Зноў наступнай, зноў наступнай. Бо разумеем, што наіўны, бяскрыўдны характар пуцейца Цанка Петрава ў рэшце рэшт стане яго лёсам. Са сваімі няхітрымі матывамі ён, можна сказаць, выпадкова аказваецца ў цэнтры наладжанай сістэмы міністэрства і яго супрацьстаяння з выкрывальнікамі, дзе кожны хоча выкарыстаць Цанка ў сваёй гульні. Без трагедый, відавочнай несправядлівасці ці смерцяў — таго, што магло б давесці гледача да экстазу, — тым не менш крок за крокам сціплы свет пуцейца перапарочваецца. Яго недарэчны антаганізм з Юліяй, якая ўвасабляе абыякавасць і эгаізм сістэмы, прыходзіць, нарэшце, да лагічнага фіналу. Дабрадушны працаўнік замахваецца на міністэрскую сцерву велізарным гаечным ключом. Вагой пяць кілаграмаў.

## Без забойстваў

Грамадскі лад штурхае да пэўных павodзін — праўда, не такіх фатальных — галоўнага героя «Атэстата сталасці» доктара Рамэа Альдэа. Паміж радкоў асабістай гісторыі тлустымі мазкамі вымалёўваецца характарыстыка цэлай сістэмы. Фільм «Атэстат сталасці», у якім галоўны герой ідзе супраць уласных прынцыпаў дзеля вырашэння будучыні сваёй дачкі, па ўсіх франтах закранае пытанні сучаснай Румыніі — расчараванасць у краіне, адсутнасць надзеі на змены ў грамадстве, карупцыя, абавязковая вера ў тое, што жыццё за мяжой лепшае, жаночая апатыя ўжо як стан грамадства ўвогуле. Галоўны герой з самага пачатку, калі дома скончылася зубная паста, і на працягу ўсяго фільма вырашае бясконцыя праблемы. Галоўная — адправіць дачку вучыцца за мяжу, куды яна, здаецца, і не хоча. Камера сочыць за мітуснёй Рамэа Альдэа; разрываннем паміж дачкой, жонкай, маці і палюбоўніцай; дыялогамі, дзе выяўляецца стаўленне да рэчаіснасці. І паказваецца ўсё без васьмёрак, агульнымі планамі — а гэта тое ж самае, што без кантакту. Румынія, згодна з «Атэстатам сталасці», — гэта грамадства з неналаджанай камунікацыяй.



Кадр з фільма «Сьераневада».

У гэтым сэнсе фільм Крысціяна Мунджыу пераклікаецца з візуальна прыгожым фільмам з Кітая «Я не мадам Бавары» Фэна Сяагана — гісторыяй татальнага непаразумення паміж адзінокай жанчынай і чыноўнікамі. Галоўная гераіня дзесяць гадоў спрабуе даказаць, што яе развод з мужам быў фіктыўным дзеля вырашэння жыллёвага пытання (той ажаніўся з іншай). Простая жанчына з правінцыі «дайшла» да Пекіна, што выклікала супрацьстаянне мясцовай улады. Чыноўнікі, за клопатам пра вобраз рэгіёна, спрабуюць не дапусціць яе ў сталіцу і па найлепшых законах абсурду — напэўна, і жыцця — забываюцца, што клапаціцца трэба пра рэальнае вырашэнне пытання. Глыбакадумныя, іранічна пабудаваныя разважанні мэра ніспраўяргаюць хваленую мудрасць «старэйшых», бо ў гэтым выпадку застаюцца проста «бла-бла». Фільм «Я не мадам Бавары» стаў віртуознай анталогіяй метадаў — жывапісных канонаў, камедыі, абсурду, пагонь, меладрамы, але так і застаўся б зборнікам гатовых формул, калі б не здзейсніў разрыў у асноўным шаблоне. Галоўная праблема гераіні выкрылася ў канцы (тым, што мяняе ўвесь сэнс карціны), які патлумачыў прынцыповасць барацьбы жанчыны тым, што развод павінен быў даць Лі Сяэлянь магчымасць нарадзіць другое дзіця. На працягу фільма на гэта не было ні адзінага намёку, што павялічыла маштаб узрушэння і ўражання. Натуральна, гэта можа ўспрымацца як драматургічны пралік, але яго можна прабачыць.

## Выштурхнутыя

Іншага кшталту кантакт з навакольным светам складваецца ў Анішаары з аднайменнага фільма Ганны-Феліча Скутэлніку. Ён гераіню не выкарыстоўвае, не прыніжае, не падаўляе, але адзінае вартае, што можа даць 15-гадовай пяшчотнай дзяўчыне (якая тут параўноўваецца з казачнай прынцэсай) — гэта маляўнічая прырода. Усё астатняе — неналаджаны побыт, цяжкая праца, агідныя п'янкі, узровень жыцця малдаўскай вёскі — катастрафічна ёй не падыходзіць. Тым не менш іншага жыцця Анішаара не ведае, моўчкі аддаецца бягучым справам, клопату пра дзядулю і малодшага брата, збору ўраджаю. Ціха апускаецца ў закаханасць і чаканне сустрэчы. Таксама бязгучна перажывае дзявочую драму, калі сустракае каханага з жонкай і маленькім дзіцем. Вечна актуальны сюжэт на рэальным матэрыяле, што паказаны з такой тонкасцю, каларытам, увагай да дэталяў, прымушае нават забыць пра яго папулярнасць, тым больш што закаханасць — амаль што пабочны, каркасны элемент фільма. Усё ж такі жывапісная вёска — не месца для Анішаары: на аўтобусе, які лейтматывам жаўцее на працягу ўсёй карціны, яна з'язджае ў далеч — і гэта the end. Мы ведаем, Малдова — адна з лідараў па эміграцыі насельніцтва за мяжу, таму канцоўка — не такая паэтычная, як падаецца.

У кыргызскую вёску — наадварот — вяртаецца Азат, галоўны герой карціны «Завяшчанне бацькі» Бакыта Мукула і Дастана Жапара Улу. Амаль інапланетнаму для гэтых мясцін чужацу, што прыехаў з ЗША, патрэбен час, каб падысці, упісацца, мімікрыраваць пад уласную радзіму. Далёкі ад ідэй касмапалітызму фільм якраз націскае на моцную сувязь чалавека і зямлі, на якой ты нарадзіўся. Каб вярнуцца ў родную вёску не толькі фізічна, Азат павінен вярнуць даўгі бацькі, навучыцца патрэбнай працы, зрабіць свой унёсак у жыццё пасёлішча — умоўна, выкупіць віну свайго роду і даказаць адданасць гэтаму месцу.

З адзінаццаці карцін Асноўнага конкурсу толькі шыкоўная вобразнасць «Лілі Лейн» ад рэальнага кантэксту, на шчасце, адмежавалася і сканцэнтравалася на асабістым, не менш каштоўным. А іскрамётны партрэт сям'і ў фільме «Сьераневада», напэўна, здольны падвесці рысу пад усёй праграмай, пунктырам узгадаць кожны — фізічны ці метафізічны — матыў.

## Не прысуд

Мастацтва — напэўна, адзіны прыстанак, дзе мы можам адчуць сябе роўнавялікімі велізарнай, складанай сістэме. Нават, магчыма, яе вянцом ці боскай істотай. У цэнтры — герой, у тэкстуры фільма — яго стасункі з наваколлем. Сістэма, бясспрэчна, мацнейшая за маленькага чалавека, але рашэнні прымае ўсё роўна апошні. Адзінаццаць фільмаў конкурсу склаліся ў пэўны вобраз-інструкцыю, як роўнавялікім стаць у жыцці. Глядзіш на сябе збоку, робіш вывады і разумееш — аўтары не выносяць прысуд, а даюць штуршок да дзеяння. Кіно — ужо не відовішча. Ты не мог уявіць — а яно насамрэч назірае за табой і той сістэмай, да якой ты прыклаў руку. І калі глядзіш фільмы ў той запаветнай кольксасці — заўважаеш, як усё пабудавана на гэтым кругазвароце, як адзінаццаць разоў паглядзелі цябе. Як у нас надзвычай шмат агульнага з гэтым кіно.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ
**ОАО «Малоритский консервноовощесушильный комбинат»**

| Наименование объекта торгов, краткие характеристики | Местонахождение | Условия продажи | Начальная цена продажи, без учета НДС, BYN | Задаток, BYN |
|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение (инв. №142/С-10969), общ. пл. 647,2 м² – здание котельной, расположенное на земельном участке пл. 0,3085 га с кадастровым номером 125250100001000205. В состав капитального строения входит забор (ж/б плиты, сетка-рабица, кирпич), протяж. 180 м.п. | Брестская обл., г. Малорита, ул. Лермонтова, 16Б | Без условий | 25 366,20 | 2 536,62 |

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10 УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 6 декабря 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 5 декабря 2016 г. до 17.00.**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «БРЕСТСКИЙ РАЙАГРОСЕРВИС»

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1.** Капитальное строение (инв. №100/С-83460) – стоянка для хранения сехники №2, общ. пл. застройки 2504,0 м², расположенное на земельном участке пл. 0,5983 га с кадастровым номером 121200000001000373 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Катин Бор, 99Б | **29 800,00** | **2 980,00** |
| **ЛОТ № 2.** Капитальное строение (инв. №100/С-83776) – стоянка для хранения техники №3, общ. пл. застройки 3772,0 м², расположенное на земельном участке пл. 0,4279 га с кадастровым номером 140100000001029803 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Катин Бор, 99Б | **40 300,00** | **4 030,00** |
| **ЛОТ № 3.** Капитальное строение (инв. №100/С-83453) – здание АЗС, общ. пл. 28,2 м², расположенное на земельном участке пл. 0,7369 га с кадастровым номером 121200000001000159 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Катин Бор, 99В | **13 200,00** | **1 320,00** |

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Условия оплаты** | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича,10 УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 27 декабря 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам: 8 (0162) 20-92-13; 21-88-81.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 26 декабря 2016 г. до 17.00.**

КАНТАКТ
№ 5 (39)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»
Сумесны выпуск з РУП «Белпошта»



■ Крэатыў

# Ліст... да самой сябе

### Беларуская школьніца адзначана ўзнагародай Сусветнага паштовага саюза

**Міжнародная арганізацыя, у якой прадстаўлены каля 200 краін, штогод праводзіць эпістальярны конкурс сярод моладзі. Маштабы яго велізарныя: сёлета ў ім паўдзельнічалі каля 980 тысяч хлопцаў і дзяўчат з 60 краін. Вытрымаўшы сур'ёзную канкурэнцыю, у ліку канкурсантаў, якія атрымалі заахвочвальную прэмію, аказалася жыхарка пасёлка Сноў Нясвіжскага раёна Віталіна ВІННІК.**

Нягледзячы на ўзрост удзельнікаў — да 15 гадоў, — тэмы сачыненняў ім прапаноўваюцца зусім не дзіцячыя. Напрыклад, у мінулым годзе юным канкурсантам прыйшлося паразважаць аб тым, у якім свеце ім хацелася б жыць. Сёлета эпісталярнае «спаборніцтва», гісторыя якога пачалася ў 1971 годзе, адзначыла юбілей, таму тэма была ўскосна прымеркавана да падзеі і гучала так: «Напішы ліст сабе 45-гадоваму».

Як паведаміла **намеснік дырэктара Мінскага філіяла РУП «Белпошта» Алена ІШЧУК,** конкурс праводзіцца ў некалькі этапаў: спачатку на абласным і рэспубліканскім узроўнях, пасля работа-пераможца дасылаецца ў штаб-кватэру саюза ў Берн, у Швейцарыю. Беларускія школьнікі ўдзельнічаюць у конкурсе на працягу ўжо 20 гадоў, і не аднойчы за гэты час прадстаўнікі нашай краіны займалі ў ім прызавыя месцы. У гэтым годзе перамога дасталася дзяўчынцы з В'етнама. Наша Віталіна была адзначана дыпломам, а таксама атрымала пасланне ад генеральнага дырэктара саюза Бішара Хусейна, перакладзенае ў тым ліку і на беларускую мову. Узнагароджанне і перадача памятных прызоў ад Сусветнага паштовага саюза і РУП «Белпошта» адбыліся падчас урачыстай лінейкі ў Сноўскай сярэдняй школе.

У розных інтэлектуальных спаборніцтвах, канферэнцыях і алімпіядах шасцікласніца Віталіна ўдзельнічае амаль са сваіх першых дзён у школе. Аднак перамога ў рэспубліканскім эпісталярным конкурсе стала для яе нечаканасцю.

— Калі я даведалася аб выніках, я расплакалася. Настолькі мяне перапаўнялі эмоцыі! Узнагарода ад Сусветнага паштовага саюза — гэта так ганарова. Дыплом абавязкова зойме сваё месца на маёй паліцы з граматамі, — распавяла дзяўчынка.




Над лістом школьніца працавала доўга, у якасці асновы выбрала падтэму «11 рэчаў, якія я зразумела за 11 гадоў». Кожны выраз звязаны з пэўным прадметам — крыштальны шар, засушаная кветка або паштоўка маме, — які дзяўчынка складвае ў шкатулку памяці. Галоўнае пытанне, якое яна задае сабе дарослай: а ці памятаеш ты аб светаадчуванні часоў свайго юнацтва? Дарэчы, шкатулка памяці існуе не толькі ва ўяўленні, але і ў рэчаіснасці, так што, магчыма, ужо дарослая Віталіна сапраўды адкрые яе праз тры дзесяцігоддзі.

Першай свой ліст дзяўчынка паказала маці, якая, дарэчы, па сумяшчальніцтве з'яўляецца і яе настаўніцай рускай мовы і літаратуры. Цяпер нястомная даследчыца працуе над чарговым конкурсным заданнем ад адной са сталічных гімназій: вывучае жыццёвы шлях Георгія Жукава. У бліжэйшых планах — паездка на канферэнцыю ў Маскву, якая стане для Віталіны ўжо 26-й па ліку.

— З будучай прафесіяй я пакуль не вызначылася, але, спадзяюся, яна будзе звязана з мовамі. У школе мне больш за ўсё падабаюцца руская і англійская мовы, літаратура, гісторыя, — кажа дзяўчынка. — Вядома, атрымліваць узнагароды, а тым больш перамагаць — вельмі прыемна. Але ўдзельнічаю я ў конкурсах не дзеля гэтага, а таму, што хачу развівацца. Гэта так захапляльна!

**Дар'я КАСКО.** kasko@zviazda.by

■ Лікбез для школьнікаў

# У гасцях у Печкіна

**Свой шлях да кожнага кліента брэсцкія паштавікі пачалі з самых маленькіх. Вучняў пачатковых класаў у кінатэатр «Беларусь» запрасіў самы сапраўдны паштальён Печкін — усім вядомы мультыплікацыйны персанаж з цяжкай сумкай на плячы і нязменным веласіпедам.**



Ад сустрэчы з вусатым паштальёнам малыя былі ў захапленні. Яны скакалі вакол яго, тузалі за рукаў, кожны стараўся дакрануцца да Печкіна, нешта спытаць у яго. «Так паступова ад вясёлай гульні-забаўлянкі ў фае перайшлі да гульні пазнавальнай у зале», — расказала пра мерапрыемства **начальнік камерцыйнага аддзела Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта» Кацярына КОЗЕЛ.**

Школьнікаў запрасілі паўдзельнічаць у віктарыне, а заадно расказалі ім, якія магчымасці ў камунікацыях дае сёння чалавеку пошта. Вядучыя спачатку высветлілі, што дзеці ведаюць аб парадку адпраўкі пісьма альбо паштоўкі. І ў гульнявой форме пастараліся іх навучыць, як правільна запоўніць канверт, напісаць адрас, падпісаць паштоўку. Дарэчы, на пытанне, што рабіць з гатовым пісьмом, не ўсе адразу і ўпэўнена ўказалі на паштовую скрыню. Апошняе сведчыць аб тым, што пакаленне гаджэтаў і планшэтаў не вельмі добра арыентуецца ў сучасных магчымасцях пошты.

Пра кірункі развіцця паштовай сувязі школьнікам таксама расказвалі і на прыкладзе посткросінгу. Ён, як вядома, дае магчымасці абменьвацца тэматычнымі паштоўкамі з карыстальнікамі ўсяго свету. За правільныя адказы ўдзельнікі віктарыны атрымлівалі ў падарунак дзіцячыя часопісы. А самым юным кліентам расказвалі, як можна аформіць падпіску, каб цікавыя і маляўнічыя выданні прыходзілі ў дом рэгулярна.

Кацярына Аляксееўна лічыць, што свята ўдалося, вучні атрымалі задавальненне і патрэбную інфармацыю. А дарослыя прыйшлі да высновы аб неабходнасці пастаяннай работы з юнай аўдыторыяй. Для дзяцей карысна вучыцца пісаць на паштоўках, выказваць свае думкі і пачуцці з дапамогай літар і слоў. Важна данесці да іх, як прыемна атрымліваць такое пасланне: цяпло душы, перададзенае паперы падчас пісання, не заменіць ніякая электроніка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ З першых вуснаў

# «УДЗЯЛЯЕМ КЛІЕНТАМ СТОЛЬКІ ЧАСУ, КОЛЬКІ ПАТРЭБНА»

### Пра сучасныя тэрміналы, новыя паслугі і дастаўку тавараў на дом

**Якія новыя паслугі ўвяла пошта за апошнія гады? Ці даступныя яны вяскоўцам? Як вырашаюцца праблемы з чэргамі? І што можна набыць у паштовай інтэрнэт-краме? На актуальныя пытанні аб дзейнасці прадпрыемства адказала першы намеснік генеральнага дырэктара Белпошты Алена СКРЫПЧЫК.**



***— Дэвіз Белпошты — «Хуткасць. Надзейнасць. Даступнасць». Што сёння стаіць за гэтымі словамі?***

— Пад такім дэвізам калектыў прадпрыемства працуе вось ужо больш за 20 гадоў. Мы строга захоўваем стандарты па прыёме, перасылцы і дастаўцы ўсіх відаў паштовых адпраўленняў, забяспечваем бесперабойную работу тэхнікі і транспарту, укараняем новыя тэхналогіі. Гэта штодзённая карпатлівая праца ўсяго шматтысячнага калектыву: паштальёнаў, аператараў, сартавальнікаў, кіроўцаў.

У нашай сетцы сёння 3305 аб'ектаў паштовай сувязі, 73 працэнты з якіх у сельскай мясцовасці, у тым ліку 222 перасовачныя аддзяленні. Гэта дазваляе задавальняць патрэбы насельніцтва і пры гэтым пашыраць спектр паслуг. Паколькі ўсе аб'екты паштовай сувязі маюць аднолькавае тэхнічнае абсталяванне, паслугі ў роўнай ступені даступныя жыхарам як гарадоў, так і аддаленых сельскіх населеных пунктаў.

Трэба сказаць, што беларуская пошта прызнана адной з найлепшых у свеце па ўзроўні развіцця электронных паслуг. Так, наша краіна — першая ў рэгіёне СНД, паштовая служба якой у 2013 годзе атрымала сертыфікат S42 Сусветнага паштовага саюза, які пацвярджае міжнародны стандарт адрасавання.

***— Якія новыя паслугі за апошнія гады ўвяла пошта?***

— Спектр паштовых і няпрофільных паслуг шырокі. Напрыклад, юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам мы прапануем комплекснае абслугоўванне ў выдзеленых цэнтрах «Бізнес-пошта» (такіх у краіне на сёння адкрыта 60). Абанементнае абслугоўванне ў офісе «Паштовы кур'ер кожны дзень» дазваляе дастаўляць адпраўленні «ад дзвярэй да дзвярэй» у любую кропку Беларусі і больш чым у 200 краін свету ў максімальна кароткія тэрміны. Карпаратыўным кліентам прапануем таксама карыстацца «гібрыднай поштай», у тым ліку бесканвертнымі адпраўленнямі.

Адпраўленні лінейкі «Камфорт» дазваляюць атрымальніку выбраць час і адрас уручэння, а адпраўніку ў гэты дзень прыходзіць SMS-паведамленне аб тым, што ліст ці пасылка дастаўлены.

Пошта распрацавала таксама праграмныя прадукты, якія дазваляюць атрымліваць пенсіі, дапамогі, грашовыя пераводы ў любым аддзяленні сувязі незалежна ад месца жыхарства. Усе аддзяленні прымаюць плацяжы ў сістэме ДРІП.

***— Якія з паслуг найбольш запатрабаваныя ў карыстальнікаў?***

— Найбольш папулярныя паслугі, якія забяспечваюць мінімальныя тэрміны перасылкі адпраўленняў і камфортныя ўмовы дастаўкі. Напрыклад, паскораная пошта (EMS Belpost): лісты і пасылкі дастаўляюцца на наступны рабочы дзень у любую кропку Беларусі. Запатрабаваны таксама адпраўленні простай пісьмовай карэспандэнцыі «1 клас» з сэрвісам «сачэнне», паслуга «Аплачаная дастаўка ў вячэрні час».

***— Цяпер ідзе падпісная кампанія. Раскажыце, як можна лёгка аформіць падпіску на друкаваныя выданні, не выходзячы з дому?***

— На сайце Белпошты працуе сістэма «Інтэрнэт-падпіска». Каб скарыстацца гэтай паслугай, трэба перайсці па адпаведнай спасылцы — «Падпіска». Там можна азнаёміцца з каталогамі, дзе ўтрымліваецца больш за тры з паловай тысячы найменняў выданняў. Неабходную газету ці часопіс можна адшукаць па алфавіце ці па тэматыцы. Аплачваецца падпіска банкаўскімі карткамі Visa і MasterCard, а таксама пры дапамозе электронных грошай EasyPay.

***— З мінулага года працуе паштовая інтэрнэт-крама. У чым яе асаблівасці? Наколькі яна папулярная?***

— У апошняе дзесяцігоддзе ў нашай краіне імкліва развіваецца электронны гандаль, і мы вырашылі не адставаць ад гэтай тэндэнцыі. Паштовую інтэрнэт-краму беларускіх тавараў Shop.belpost.by мы зрабілі найбуйнейшай віртуальнай гандлёвай пляцоўкай, якая аб'ядноўвае вядучыя айчынныя брэнды.

На сёння Белпошта мае шырокую сетку аддзяленняў сувязі, шматгадовы вопыт дастаўкі адпраўленняў па прынцыпе «ад дзвярэй да дзвярэй», уласны аўтатранспарт. Усё гэта дазваляе прадпрыемству дастаўляць кліентам заказаны тавар нават у самыя аддаленыя куткі краіны.

Акцэнт на айчынных вытворцаў зроблены не выпадкова. Як вядома, беларускія брэнды цэняцца сваёй высокай якасцю і даступным узроўнем цэн. Асартымент разнастайны, лінейкі тавараў пастаянна папаўняюцца. Сёння, напрыклад, на сайце прадстаўлена прадукцыя 206 айчынных вытворцаў, размешчана больш за 4800 тавараў: для дома і сям'і, для дачы і адпачынку, бытавая тэхніка, касметыка і парфумерыя, адзенне і абутак, дзіцячыя тавары. Штодня віртуальную гандлёвую пляцоўку наведвае каля тысячы пакупнікоў. За 10 месяцаў бягучага года інтэрнэт-крама выканала 33,9 тысячы заказаў, што ў тры разы больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

Акрамя таго, з кастрычніка штомесяц выдаюцца каталогі з акцыйнымі таварамі, прадастаўляюцца зніжкі пакупнікам. Перавагі каталожнага гандлю ў першую чаргу ацанілі жыхары сельскай мясцовасці. У іх з'явілася магчымасць набываць неабходныя тавары, не плануючы паездкі ў райцэнтр і не марнуючы час.

***— Ці закранула пошту аптымізацыя? І як вырашаецца пытанне аб тым, захаваць аддзяленне ў раёне ці не?***

— Так, закранула. Сетка стацыянарных сельскіх аддзяленняў сувязі сфарміравалася некалькі дзесяцігоддзяў таму. Але з таго часу прайшло шмат змен — міграцыя і натуральнае змяншэнне вясковага насельніцтва, аптымізацыя сельсаветаў. Усё гэта паўплывала на работу нашых аб'ектаў.

Каб знізіць выдаткі, Белпошта праводзіла аптымізацыю сеткі шляхам перагляду рэжымаў работы аб'ектаў, пераводу аддзяленняў у пункты паштовай сувязі. Адначасова праводзілася мадэрнізацыя паштовай сувязі, скарачэнне неэфектыўных працоўных месцаў і стварэнне новых за кошт пераходу на сучасныя тэхналогіі.

Пры разглядзе пытання закрыцця аддзяленняў падыход індывідуальны. З улікам меркавання жыхароў і па ўзгадненні з мясцовымі органамі ўлады прымаецца аб'ектыўнае рашэнне. Некаторыя сельскія населеныя пункты пераводзяць на абслугоўванне перасовачнымі аддзяленнямі паштовай сувязі, якія па тэхнічным абсталяванні роўныя па вартасці гарадскім аддзяленням.

***— Заўважалі, што пры аплаце паслуг большасць людзей аддае перавагу менавіта аддзяленням сувязі. На вашу думку, з чым гэта звязана?***

— Думаю, справа ў тым, што пошта задавальняе патрэбы шырокіх слаёў насельніцтва, у тым ліку асоб, якія праз узрост, маёмаснае становішча і іншыя прычыны не валодаюць інфармацыйнымі тэхналогіямі ў аб'ёме, які дазваляе адмовіцца ад аплаты паслуг у традыцыйным фармаце.

Працоўныя месцы ў аддзяленнях паштовай сувязі набліжаны да ўніверсальных, з улікам пажаданняў карыстальнікаў. На ўсіх месцах прадастаўляецца максімальна магчымая колькасць паслуг па заяўным прынцыпе аднаго акна. Пры гэтым аператар паштовай сувязі ўдзеліць кліенту столькі ўвагі і часу, колькі патрэбна.

***— Як вырашаецца праблема з чэргамі?***

— Адна з асаблівасцяў работы паштовых аддзяленняў — гэта нераўнамерная нагрузка. Акрамя таго, большасць кліентаў атрымлівае па некалькі паслуг (адначасова паштовых і няпрофільных). Каб скараціць час абслугоўвання ў аддзяленнях, устанавілі тысячу плацежна-даведачных тэрміналаў, уводзім электронную чаргу. У Мінску ўкаранілі 41 тэрмінал самаабслугоўвання SmartPOST па прыёме заказных паштовых адпраўленняў. Зрабілі так, каб пенсію і сацыяльную дапамогу можна было атрымаць у любым аддзяленні краіны, незалежна ад таго, дзе гэтыя выплаты прызначаны. Плюс у кожным гарадскім аб'екце сувязі, які мае тры і больш аперацыйныя акны, арганізуецца спецыяльнае працоўнае месца па прадастаўленні толькі паштовых паслуг.

***— Дарэчы, пра тэрміналы самаабслугоўвання. Наколькі яны запатрабаваныя? Людзі лёгка асвоілі новую тэхніку?***

— Статыстыка паказвае, што тэрміналы самаабслугоўвання карыстаюцца попытам. Так за 9 месяцаў мінулага года з дапамогай плацежна-даведачных тэрміналаў пошта аказала 15,7 мільёна паслуг, за 9 месяцаў бягучага года — 16,5 мільёна.

Варта заўважыць, што наша задача не зводзіцца толькі да тэхнічнага боку справы. Мы стараемся прасоўваць новы сэрвіс сярод насельніцтва. Напрыклад, штомесяц, у перыяд максімальнай нагрузкі з 15 па 25 чысло, у аддзяленнях паштовай сувязі праводзіцца акцыя «Бліжэй да кліента». Як правіла, аднойчы аплаціўшы паслугі праз тэрмінал з дапамогай спецыялістаў, кліенты ў далейшым карыстаюцца ім самастойна. Асвойваць новыя сэрвісы імкнецца не толькі моладзь, але і пенсіянеры. Усё больш кліентаў разумеюць, што тэрміналы — гэта сучасны, зручны і хуткі спосаб аплаты розных паслуг.

***— Як плануецца ўдасканальваць работу паштовых аддзяленняў надалей?***

— Прадпрыемства нацэлена на павышэнне якасці прадастаўлення паслуг. Плануем мадэрнізацыю паштовай інфраструктуры: перагляд зон абслугоўвання і ўзбуйненне сельскіх аддзяленняў паштовай сувязі, развіццё сеткі абанементных паштовых скрынак (у першую чаргу ў катэджных пасёлках і сельскіх населеных пунктах з высокай працягласцю даставачных участкаў).

Працягнем устаноўку ў аддзяленнях сістэмы кіравання патокамі кліентаў «Электронная чарга», паштаматаў, будзем развіваць сетку кур'ераў. Робім усё, каб нашым кліентам было камфортна.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Рэгіянальны зрэз

### Дырэктар Гомельскага філіяла Белпошты Галіна ЦЯРЭШЧАНКА:

— Гомельская вобласць дастаткова вялікая. На сёння ў нас амаль 55% аддаленых населеных пунктаў абслугоўваецца з дапамогай аўтатранспарту. Размова ідзе не толькі пра перасоўныя пункты паштовай сувязі, але і персанальную дастаўку пенсіі, карэспандэнцыі і іншых паслуг з дапамогай мотатранспарту. Да таго ж, у кожнага паштальёна ёсць свае пастаянныя кліенты, якіх ён добра ведае, да якіх рэгулярна заходзіць. Многія людзі замаўляюць у паштальёнаў пэўныя паслугі. Напрыклад, прыём плацяжоў, набыццё тавараў народнага спажывання. І, вядома, афармляюць падпіску. У многіх паштальёнаў напрацавана добрая кліенцкая база, і супрацоўнікі ёй даражаць. Таму заўсёды загадзя, пачынаючы з папярэдняга месяца, нагадваюць сваім кліентам пра тэрміны падпіскі. Гэта важна і для людзей, якіх абслугоўваем, і для саміх паштальёнаў. Яны разумеюць: ад таго, які тыраж яны зробяць сёння, залежыць іх заробак заўтра.

### Намеснік дырэктара Мінскага філіяла Белпошты Алена ІШЧУК:

— Для таго, каб максімальна задаволіць чаканні кліентаў, Белпошта пастаянна ўдасканальвае сваю работу. Не абыходзім увагай і сельскіх жыхароў. Цяпер спектр паслуг, якія аказваюцца нават у невялікім сельскім аддзяленні паштовай сувязі, адпавядае сталічнаму ўзроўню. Паштальён у вёсцы найбольш блізкі да сваіх кліентаў. Сёння ён не толькі прыносіць газеты і пісьмы, але можа таксама аформіць заказ у паштовай інтэрнэт-краме, дзе прапаноўваюцца тавары айчынных вытворцаў.

Дарэчы, з 22 лістапада запушчаны новы партнёрскі праект з беларускімі інтэрнэт-крамамі: каталог «Тавары поштай». Тут можна набыць новую бытавую тэхніку, навагоднюю прадукцыю, тавары для дома, дзяцей, аўтааматараў і іншыя. Кліент вызначаецца з пакупкай, тэлефануе ў інтэрнэт-краму, а пошта ажыццяўляе дастаўку.

# ПОШТАМАБІЛЬ ЯК СРОДАК ХУТКІХ ЗНОСІН

**Вёска Зарэсце Магілёўскага раёна амаль тры гады як перайшла на перасовачнае паштовае абслугоўванне. У вёсцы жыве ўсяго 214 чалавек, а гэтага недастаткова, каб стацыянарнае аддзяленне сувязі магло працаваць рэнтабельна. Затое поштамабіль паспявае абслугоўваць не толькі гэту вёску, але і яшчэ 8 населеных пунктаў, размешчаных па маршруце. А гэта больш чым 700 жыхароў.**

Вось і зараз каля паштовага фургона ўтварылася невялічкая чарга. Хто грошы здымае, хто прыцэньваецца да навагодніх сувеніраў, хто цікавіцца перыёдыкай. Мясцовы жыхар Валерый Раінчыкаў паслугамі поштамабіля карыстаецца ўсяго некалькі разоў у месяц. Прыходзіць, каб за камуналку заплаціць, грошы зняць або рахунак на тэлефоне папоўніць. Абслугоўваннем паштавікоў задаволены.

— Тавар купіць можна і ў краме, іх у нас дзве, а нам цікава з Вольгачкай пагутарыць, — усміхаецца мужчына з чаргі. Астатнія яго падтрымліваюць. Так ласкава яны звяртаюцца да **начальніка перасовачнага аддзялення сувязі №2 Вольгі МАРЧАНКІ**, якая для насельніцтва і прадавец, і касір, і проста душэўны чалавек. Яна і апошнімі навінамі падзеліцца, і абслужыць па першым разрадзе.

Блакітны фургончык з белай палоскай на баку прыязджае строга па графіку. Кіроўца транспартнага цэха лагістычнага цэнтра магілёўскага філіяла «Белпошта» Аляксей Жэлябідка на гэтым маршруце працуе каля паўгода і да справы ставіцца з поўнай адказнасцю.

— У 7.10 раніцы выязджаю пад загрузку, у 7.35 грузімся — і на маршрут, — расказвае ён пра асаблівасці работы. — Не паспеем прыехаць, як людзі ўжо ідуць. Працую з задавальненнем. Прырода, вёскі. Ужо, напэўна, кожнага жыхара ведаеш у твар.

На вуліцы марозна, але вяскоўцы не вельмі спяшаюцца дадому. Прыемна пастаяць побач, паразмаўляць.


Вольга МАРЧАНКА дапамагае выбраць паштоўку да Новага года.

— Вядома, стацыянарная пошта лепш, але ж мы разумеем, што дзяржаве цяжка. Людзей у вёсцы з кожным годам усё менш і менш. Прыходзіцца прыстасоўвацца, — разважае мясцовая жыхарка Алена Малахава. — Да абслугоўвання ніякіх пытанняў, дзяўчаты малайцы. Мы тут пасылкі адпраўляем, унукам размалёўкі і цацкі купляем, сабе — крышкі для закручвання, нават каструлі. Калі трэба, і мяшок цукру прывязуць, і пральны парашок вагой 5 кілаграмаў. Бяры, што душа пажадае. Толькі б грошы былі. Вольга Васілеўна нам латарэйныя білеты прапаноўвае, нагадвае, каб на газеты падпісваліся. Ведае, каму што трэба.

Да чаргі далучаецца Алена Шчарбакова, якая працуе загадчыцай ФАПа і прыйшла, каб здаць выручку — пры ФАПе функцыянуе аптэка, дзе людзі набываюць лекі. Яна таксама задаволена работай перасовачнай пошты.

Аўтарытэт пошты ў глыбінцы шмат у чым залежыць ад паштальёна. **Кацярына ГАНЧАРОВА** — прадстаўнік гэтай службы на месцы. Абслугоўвае вёскі Зарэсце і бліжэйшыя Васілевічы. Чалавек яна вопытны, ужо 6 гадоў як на гэтай пасадзе:

— Прыязджае машына, я атрымліваю газеты, лісты, часопісы, пераводы, пенсіі — і панесла па хатах. У Зарэсці, напрыклад, на 76 двароў — 68 падпісчыкаў. Практычна ў кожны двор прыходзяць газеты. У пенсіянераў прымаю камунальныя плацяжы, рэалізую тавары штодзённага попыту — людзям зручна. Тут некаторыя прадукты нават танней, чым у краме. Напрыклад, макароны, алей сланечнікавы, цукар.

Як любая паважаючая сябе фірма, пошта забяспечвае сваіх падначаленых усёй неабходнай амуніцыяй. Кацярына Міхайлаўна дэманструе зручную шэрую куртку з святлоадбівальнымі ўстаўкамі, паштовую сумку.

— А яшчэ нам выдаюць скураныя і гумавыя боты, — кажа яна. — І веласіпед. Летам я на ім дабіраюся да Васілевіч, а вось зімой прыходзіцца пешшу. Але дарога добрая, праблем ніякіх.

— Наша работа пастаўлена так, каб максімум паслуг аказваць на даму, — адзначае **намеснік начальніка аб'яднанага цэха паштовай сувязі Магілёўскага філіяла Белпошты Алена АЎСЯЙКОВА.** — Але ёсць паслугі, якія магчыма атрымаць выключна цераз перасовачнае аддзяленне сувязі. Папоўніць крэдыт, правесці іншыя аперацыі з пластыкавымі карткамі кліентаў і гэтак далей у паштальёна няма магчымасці. Наогул увесь Магілёўскі раён абслугоўвае 29 стацыянарных аддзяленняў паштовай сувязі плюс два перасовачныя. На тым жа маршруце №2 з дзевяці населеных пунктаў працяглыя па часе стаянкі прадугледжаны толькі ў Зарэсці і Брылях, дзе насельніцтва болей як 200 чалавек. У астатнія вёскі машына заязджае ў залежнасці ад дзён выплаты пенсій, наяўнасці карэспандэнцыі і перыёдыкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# «САЦЫЯЛЬНЫ СПЕЦНАЗ»

**Паштавікі Віцебшчыны заўсёды даедуць, дойдуць туды, куды трэба. Для гэтага ёсць і адпаведная тэхніка. У прыватнасці, легкавыя ўсюдыходы УАЗ, якія выкарыстоўваюцца і ваеннымі.**

Асаблівасць паўночнай вобласці краіны ў тым, што тут найбольшая колькасць населеных пунктаў: больш за 5,7 тысячы. Але ўсе патрабаванні так званых сацыяльных стандартаў выконваюцца: не меней чым 5 разоў на тыдзень аказваюцца паштовыя паслугі.

— Мы абслугоўваем усе без выключэння вёскі. Нават калі там толькі адзін жыхар. Напэўна, няма сярод дарослых жыхароў Віцебшчыны такіх, якія хаця б раз у год не скарысталіся нашымі паслугамі. Хаця, ведаю, выконваем і заказы дзятвы. Як? У апошні час усё больш папулярныя пакупкі праз інтэрнэт. Дасведчаныя дзеці з дазволу бацькоў заказваюць на сайтах, напрыклад, тэлефоны, навушнікі, планшэты... А потым дарослы атрымлівае тавары пасля прад'яўлення пашпарта. Людзі ведаюць, што пошта не падвядзе. Своечасова з Кітая або любой іншай краіны будзе дастаўлена пасылка, бандэроль у паштовае аддзяленне або дамоў, — расказвае **намеснік дырэктара Віцебскага філіяла РУП «Белпошта» Кацярына ЗІНКЕВІЧ.**

Наконт, можна і так сказаць, эксклюзіўных паслуг «паштовага спецназа». Многім пенсіянерам пералічваюць пенсіі на банкаўскія карткі. Вядома, зручна і адпавядае патрэбам часу. Але банкамата ў вёсцы няма... І што рабіць? Паштовы работнік на перасоўным аддзяленні сувязі прыедзе і выручыць.

Аналагічным чынам прывозяць і прадукты харчавання, прадукцыю бытавой хіміі, нават электрапрыборы.

У «арсенале» паштавікоў Прыдзвіння на сёння вялікі парк тэхнікі. Тых жа перасоўных аддзяленняў ужо больш за 40. Калі прасцей і эфектыўней даехаць на веласіпедах, выкарыстоўваюцца гэтыя «колы». Але, зразумела, позняй восенню і тым больш зімой на іх не паедзеш... І пешшу ідуць да кліентаў паштальёны, калі недалёка. Гужавы транспарт ужо даўно не выкарыстоўваецца.


Перасовачнае аддзяленне паштовай сувязі.

Кліенты прывыклі, што Белпошта перыядычна прапаноўвае новыя паслугі.

— Сярод новых паслуг Netліст. Яна для тых, каму неабходна пераслаць інфармацыю ў максімальна кароткія тэрміны. Netліст можна адправіць у любым аддзяленні паштовай сувязі, у тым ліку і ў электроннай форме. Усё больш запатрабаваная «Мясцовая рассылка» — для фірм, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія хочуць пашырыць кліентуру. Буклеты і іншая рэкламная прадукцыя будзе распаўсюджаная па паштовых скрынях, — працягвае Кацярына Зінкевіч.

Дзелавым людзям прапануюць і комплексную паслугу «Паштовы маркетынг». Гэта добрая магчымасць вывучыць попыт на прадукцыю, атрымаць прапановы ад патэнцыйных спажыўцоў...

Нядаўна адбылася нарада, на якой былі падведзены вынікі работы за 9 месяцаў бягучага года. Дырэктар Віцебскага філіяла РУП «Белпошта» Сяргей Максак выступіў з дакладам аб выкананні паказчыкаў. Расказаў і пра паказчыкі маніторынгу. На мерапрыемстве былі падведзены вынікі абласнога спаборніцтва калектываў структурных падраздзяленняў. 1-е месца ў Глыбоцкага РУПС, 2-е месца — у Чашніцкага РУПС, 3-е месца — у Наваполацкага ГУПС.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

**Адказная за выпуск Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

